**4 лістапада 2025**
**https://davoliby.org/**

# Заява руху "Шлях да Волі" аб пераназве фракцыі

Рух "Шлях да Волі" паведамляе аб рашэньні зьмяніць назву фракцыі ў Каардынацыйнай Радзе з "Блёк «Воля»" на "Шлях да Волі".

Апошнія дні былі адзначаныя працяглымі і непрадуктыўнымі спрэчкамі наконт легітымнасьці фракцыі. Замест працы над рэалізацыяй праграмных мэт, значная частка рэсурсаў накіроўвалася на працэдурныя пытаньні. Пераназва дазволіць нам пакласьці канец гэтым дыскусіям і сканцэнтравацца на справах.

Назва "Шлях да Волі" адлюстроўвае нашую пазыцыю: мы застаемся вернымі ідэям і каштоўнасьцям блёку "Воля", але разумеем, што шлях да рэалізацыі праграмных мэт патрабуе пасьлядоўнай і сыстэмнай працы. Мы не адмаўляемся ад мэт, але падкрэсьліваем рэалістычнасьць падыходу да іх дасягненьня.

Рэпутацыйныя рызыкі, зьвязаныя з папярэднімі канфліктамі, маглі б стварыць перашкоды для далучэньня новых актывістаў і валянтэраў. Абноўленая назва дасьць нам магчымасьць пачаць дыялёг з патэнцыйнымі сябрамі без нэгатыўнага асацыятыўнага шэрагу.

Мы падкрэсьліваем, што гэтая зьмена з'яўляецца канструктыўным крокам наперад, а не спробай адмежавацца ад блёку «Воля» ці яго спадчыны.

Ад імя руху "Шлях да Волі",

Віталь Пацехін
Пётр Маркелаў